Людына, А. Фотаздымкі апавядаюць, або падарожжа па нязведаных старонках гісторыі / А. Людына // Зара (Бешанковічы). – 2018. – 13 лют. – С. 3.

Фотаздымкі апавядаюць, Падарожжа па нязведаных старонках гісторыі

29 год мінула з дня вываду савецкіх войск з Афганістана, але з цягам часу афганскі боль не сціхае. Сярод тых, хто прайшоў праз афганскі горан – шмат знаёмых, пра каго газета не раз пісала, людзей шаноўных і паважаных. Вось і вырашылі мы наведацца ў гісторыка-краязнаўчы музей, каб зрабіць падарожжа па яшчэ нязведаных старонках гісторыі «вайны за ракой».

У фондах музея сярод іншых рэчаў захоўваецца спіс нашых землякоў, якім давялося выконваць свой інтэрнацыянальны абавязак у Рэспубліцы Афганістан. Іх 55 – мужных, верных прысязе, Радзіме і воінскаму абавязку сыноў бешанковіцкай зямлі. Напрыклад, маёр Валерый Віктаравіч Сафонаў і прапаршчык Канстанцін Мікалаевіч Звездзянкоў узнагароджаны ордэнамі Чырвонай Зоркі і «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трэцяй ступені, маёр Фёдар Іпалітавіч Яжэнькін – ордэнам «За службу Радзіме ва Узброеных Сілах СССР» трэцяй ступені і медалём «За адвагу», радавы Ігар Мікалаевіч Скуратаў адзначаны медалямі «За адвагу» і «Воіну-інтэрнацыяналісту ад узячнага афганскага народа», капітан Аляксандр Іванавіч Каралёў – ордэнам Чырвонай Зоркі. Спіс гэты можна працягваць.

З ПОЛЫМЯ АФГАНІСТАНА

Тыя, хто служылі ў Афганістане і вярнуліся жывымі, да гэтага часу ў начных кашмарах зноў губляюць сваіх сяброў, гараць у танках, БТР і верталётах, падрываюцца на мінах... Да канца жыцця яны будуць несці гэтую нялёгкую ношу – памяць пра мінулае. І сваім дзецям на ўласных прыкладах яны растлумачаць, што такое мужнасць. Гартаю ўжо пажоўклыя фотаздымкі, газетныя артыкулы, анкеты, сабраныя ў тэматычных папках музейных фондаў пад назвай «Афганістан», увагу прыцягнула адно фота, дакладней, вочы мападога мужчыны з медалямі на кіцелі. Аў іх – такая стомленасць, боль і мудрасць, што становіцца страшна. Гэта сяржант В. У. Карпусенка. Валерый Уладзіміравіч ваяваў у складзе абмежаванага кантынгенту савецкіх войск у Рэспубліцы Афганістан. Камандзір аддзялення мотастралкоў Карпусенка праявіў сябе мужным воінам, смелым і знаходлівым у складанай абстаноўцы бою з сіламі контррэвалюцыі. Ордэн Чырвонай Зоркі, афганскі медаль «За адвагу» на грудзях былога воіна-інтэрнацыяналіста – сведчанне яго баявых заслуг.

Анжэла ***ЛЮДЫНА***

Фота з фондаў музея